ПАМЯЦЬ

# ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ...

**Патрыятычнае выхаванне не сыходзіць з павесткі дня ў Скідзельскім дзяржаўным каледжы.**



Кіраўнік Літаратурна-краязнаўчага музея імя Міхася Василька пры дадзенай навучальнай установе Святлана Леанідаўна Сарокіна арганізавала і правяла мерапрыемства пад назвай «Ніхто не забыты, нішто не забыта». У кожнага з гасцей было чым падзяліцца па гэтай тэме. Паважаныя скідзельцы Тамара Цімафееўна Гуліда і яе муж Уладзімір Іванавіч Гуліда згадалі жахлівыя эпізоды са свайго ваеннага і пасляваеннага жыцця ў 40-х і 50-х гадах мінулага стагоддзя. Кіраўнік Мількаўшчынскага літаратурна-краязнаўчага музея Таццяна Анатольеўна Савянкова адкрыла сакрэт капсулы, раскапанай ля помніка загінулым у Вялікай Айчыннай вайне; распавяла і пра тое, як закладвалася на гэтым жа месцы, у вёсцы Ханявічы Скідзельскага сельсавета новая капсула нашчадкам. Прадстаўнік Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Тамара Міхайлаўна Мазур зачытала ўрывак са сваёй новай кнігі «На лініі жыцця. Аповесць пра Уладзіміра Лебедзева» аб дзіцячых уражаннях героя гэтага твора пра пераможны бой савецкай арміі над фашыстамі каля вёскі Жытомля. Паэтэса таксама прачытала вершы на тэму гістарычнай памяці са сваіх паэтычных зборнікаў.

Сустрэча выклікала непрыхаваную цікавасць у навучэнцаў каледжа, якія не спяшаліся разыходзіцца і сваёй увагай значна пашырылі фармат дадзенага мерапрыемства.

**Тамара МАЗУР**
**Скідзель**

*Фота аўтара*


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ
Тамара Тимофеевна Гулида родилась в Белостоке в семье техника-лейтенанта и медсестры. В начале лета 1941-го она с мамой уехала отдыхать на Могилевщину. Там застала война.




РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ




Скидельский
государственный
колледж